Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 16
МАЙ
1931 г.

У калгасе „Энгельса“ Уваравіцкага раёну абмяркоўваюць пытаньне аб зьдзяльшчыне

Наш выклік работніцам „Дзьвіны“, „Сьцяга Індустрыялізацыі“, „Клары Цэткін“

Работніцы прадахавальнага цэху акулярнай фабрыкі на 90 проц. падпісаліся на часопісь „Беларуская работніца і сялянка“. Падпіска на часопісь праводзіцца па ўсіх цэхах фабрыкі.

Мы выклікаем работніц „Дзьвіны“, „Сьцягу індустрыялізацыі“, „Клары Цэткін“ на сацспаборніцтва па распаўсюджаньні нашай часопісі „Беларуская работніца і сялянка“.

Работніцы прадахавальнага цэху пастанавілі адлічыць у карысьць пацярпеўшым ад зямлятрасеньня адзін процант са свайго месячнага заработку і выклікалі іншыя цэхі. На выклік першы адгукнуўся цэх фітцу.

Віцебск.

Андрэева, Голубева, Баскіна.

Група лепшых ударнікаў бручнага цэху ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі“

Школьнікі ідуць на суботнік па пасадцы саду, калгас „Энгельса“, Уваравіцк. раёну.

Вітаем прапанову аб выпуску пазыкі „Трэці рашаючы год пяцігодкі“

Дэлегаткі - работніцы заводу „Бальшавік“ вітаюць прапанову рабочых электразаводу аб выпуску пазыкі „Трэці рашаючы год пяцігодкі“.

Вельмі актыўна было абгаворана гэта пытаньне на дэлегацкім сходзе. Усе дэлегаткі пастанавілі падтрымаць прапанову рабочых электразаводу і падпісацца на пазыку. ДЭЛЕГАТКА.

Менск.

Выклікаем членаў Гарсавету

Члены бытавой сэкцыі Магілеўскага гарсавету падпісаліся **на трактар імя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ на 52 р. і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу членаў іншых сэкцый гарсавету.**

Сэкратар сэкцыі ГАРЭЛІК.

У часе месячніка друку скончым пабудову трактара імя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“

У Магілеўскім раёне дэлегаткі сабралі на пабудову трактара імя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ 56 руб.

Дэлегаткі Слуцкага раёну шырока разгарнулі збор сродкаў на трактар імя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“. Яны пераслалі рэдакцыі часопісі 208 руб. 70 кап.

Дэлегаткі Бабінаўскага сельсавету, Высачанскага раёну, дадаткова прыслалі яшчэ 18 рублёў.

Не адстаюць і дэлегаткі Выдрынскага сельсавету, Высачанскага раёну, яны пераслалі рэдакцыі 21 руб. 10 кап. на пабудову трактара імя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“.

Райжанорг Магілеўскага раёну тав. Грумбіна ўносіць 4 рублі на пабудову трактара.

Хто наступны?

У карысьць політзьняволенных

Дэлегаткі мястэчка Старыя Дарогі ў адказ на разьюшаны тэрор буржуазіі сабралі ў карысьць палітзьняволеных 75 руб.

Л. У.

Ударная комсамолак

Яз. Азім

Калі крывавіцца захад у журавінах,
І вечар цешыць сонную зару,
З сваёй брыгадаю бадзёрая Галіна
Ідзе з палёў к калгаснаму двару.
Табун цялят прыгнаў пастух к аборы,
Чуваць рыканьне зычнае кароў,
А каля сіняга азмрочанага бору
Канчае ворыва калёна трактароў.
Няяснай плямаю праз вадкае супоньне,
Глытаюць постаці людзей худыя далі.
— „Эй, вы сяўцы! А мы вас многа сёньня
У сацспаборніцтве дагналі і перагналі.
Кідае Галя сноп гаручых слоў,

Лепшая ўдарная брыгада калгасу „Энгельса“ дала высокія паказальнікі з пераходам на зьдзельшчыну.

А ў словах шчырасьць, моц, жыцьцё і вера,
— Мы-ж сёньня, дзевачкі, за дзень разьбілі гной
І перавыканалі плян раней за тэрмін!
А ўвечары паседжаньні і сходы,
З пытаньнямі, як сонечная радасьць:
Чым лепш ажыцьцявіць ў працы ход
І справаздача Галінай брыгады.
Ўнутры ўздым. І ў спрэчках сонца, толк,
І рэзалюцыя, каб доўга час ня траціць
— Галініну брыгаду, камсамолак
Прэміраваць за узор ударнай працы.

Калгас „Перамога“
1931 год.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ
РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 15 МАЙ 1931



Сталёвая кавалерыя падымае цаліну. Калгас імя Дзяржынскага, Буда-Кашалёўскага раёну

Наперад да новых перамог!

Баявая дырэктыва партыі і ўраду ажыццяўлена. 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР беспаваротна павярнулі на шлях сацыялізму і аб'ядналіся ў калгасы.

У непрымірымым і рашучым наступленьні на кулака, у суровай і жорсткай барацьбе з яго права-„лявацкімі" лёкаямі мы атрымалі гэту гістарычную перамогу. Тым самым расьце і мацнее фундамант дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы. Калгаснае сялянства стала асноўнай апорай савецкай улады. Кулацтва—гэта апошняя апора міжнароднай контрэвалюцыі — „асуджана і будзе ліквідавана" (І. Сталін).

Калектывізацыя 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак мае найвялікшае палітычнае значэньне. Гэты факт—яркі довад правільнасьці генэральнай ліні партыі на разгортваньне калгаснага руху, на ліквідацыю кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі.

У барацьбе за тэмпы калектывізацыі мы дасягнулі рашаючых нязьмерна вялікіх посьпехаў. Аднак, ніякаму самазаспакаеньню ня можа быць месца. Толькі адкрытыя агенты кулака, толькі махровыя апартуністы могуць гаварыць аб гэтым. Замацаваць заваяваную перамогу і з яшчэ большай ленінскай упартасьцю, сапраўднай бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за далейшы ўздым калгаснага руху—наша асноўная задача.

Усякая найменшая спроба супакоіцца на дасягнутых рэзультатах, затармазіць новы ўздым калгаснага прыліву—простая дапамога кулаку, здрада лініі партыі. Па такіх спробах, па такой кулацкай палітыцы і практыцы трэба біць бяз усякай літасьці.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі перад намі стаяць найвялікшыя задачы. Плян другой калгаснай сяўбы павінен быць ня толькі выканан, але і перавышан. Ніякага спазьненьня, ніякай марудносьці, ніякай апартуністычнай павольнасьці дапускаць нельга. Тэрмін і тэмпы вырашаюць усё.

Між тым з пасеўнага фронту паступаюць трывожныя весткі. У цэлым радзе раёнаў веснавая сяўба разгортваецца зусім невыстарчальна. Кантрактацыя яравых пасеваў, пераход на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, ліквідацыя абязьлічкі ўсё яшчэ нездавальняюча праводзяцца ў жыцьцё. Скрозь і ўсюды барацьба за бальшавіцкую сяўбу арганічна ня зьвязана з барацьбой за нарастаньне тэмпаў калектывізацыі.

Патрэбен карэнны рашаючы пералом. Максымум сіл і энэргіі трэба кінуць на пасеўны фронт, на фронт калгаснага будаўніцтва. Мы абавязаны, фарсуючы тэмпы сяўбы, па-бальшавіцку змагацца за заўграшніх калгасьнікаў, сёнешніх аднаасобнікаў, дапамагчы ім хутчэй вырашыць пытаньне з кім ісьці—разам з рабочай клясай пад кіраўніцтвам партыі за калгасы, ці супроць калгасаў, разам з кулаком.

Трэба яшчэ больш разгарнуць найшырэйшую масавую работу сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас. Трэба з яшчэ большай непрымірымасьцю змагацца на два фронты, супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі і супроць „лявацкіх" загібаў.

Кулак і яго права-„левыя" дапаможнікі не шкадуюць сіл, каб затармазіць новы калгасны прыліў, каб дэзарганізаваць фронт веснавой сяўбы. Па кулаку, па правых і „левых" апартуністах трэба бязьлітасна біць. Толькі рашучая барацьба з кулаком і яго права-„лявацкай" агентурай забясьпечыць новыя гістарычныя перамогі ў справе суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы.

Калгасьніцы і аднасобныя бядняцка-серадняцкія масы сялянак павінны пайсьці ў авангардзе барацьбы за новы ўздым калектывізацыі, за другую бальшавіцкую сяўбу. Кожная калгасьніца павінна дабівацца таго, каб яе калгас на справе ажыццявіў пераход на зьдзельшчыну, ацененую ў працаднёх, закантрактаваў свае яравыя пасевы, ліквідаваў абязьлічку, выканаў плян сяўбы. Кожная калгасьніца павінна ўпарта і сыстэматычна ўцягваць аднаасобніц у калгасы.

Партыйныя арганізацыі абавязаны разгарнуць масавую работу сярод калгасьніц і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас сялянак, стаць на чале іх актыўнасьці, мабілізаваць іх на барацьбу супроць кулака, за калгасы, за перамогу другой калгаснай сяўбы.

Поўным пераходам калгасаў на зьдзельшчыну, правільнай арганізацыяй працы дабʻемся перамог на пасеўным фронце.

БССР ЛЕНІНА



Месячнік пралетарскага друку

Нашы абавязацельствы

Мы, рабкоркі-ўдарніцы часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ і шматтыражкі швэйнай фабрыкі „Кастрычнік“—**Баркан, Міндліна Падольская**, бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Як члены рэдкалегій цэхавых насьценгазэт, мы абавязваемся дабіцца рэгулярнага выхаду насьценгазэт і перабудовы работы газэт шляхам арганізацыі ўдарных брыгад друку.

Мы абавязваемся зрабіць нашы насьценгазэты сапраўднымі арганізатарамі мас у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за лепшую якасьць прадукцыі, за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за аўладаньне тэхнікай, у барацьбе з прагульшчыкамі, рвачамі, ныцікамі і малаверамі.

2. Мы абавязваемся весьці работу па ўцягненьні ва ўдарныя брыгады тых работніц, якія яшчэ не зьяўляюцца ўдарніцамі.

3. Да ўсебеларускага зьезду рабселькораў абавязваемся завербаваць 30 ударніц друку.

4. Удзельнічаць ва ўдарных брыгадах і рэйдах, якія праводзяцца часопісьсю.

5. Абавязваемся павесьці шырокую кампанію па распаўсюджаньні часопісі

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка“: БАРКАН, МІНДЛІНА, ПАДОЛЬСКАЯ.

* * *

Агульны дэлегацкі сход № 2, улічваючы вялікую ролю нашага друку ў часе завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, бярэ на сябе наступныя абавязкі:

1. Правесьці 100 проц. падпіску на часопісь „Беларуская работніца і сялянка“.

2. Штомесячна адлічыць 5-10 капеек на дапамогу замежнаму камуністычнаму друку

3. Арганізаваць ударную брыгаду рабкорак, якая будзе прымаць удзел у рэйдзе, які праводзіцца рэдакцыяй „Беларуская работніца і сялянка“.

4. Змагацца праз друк за выкананьне і перавыкананьне нашага прамфінпляну, паляпшэньне якасьці прадукцыі, за разгортваньне крытыкі і самакрытыкі.

5. Сыстэматычна практыкаваць прапрацоўку палітычных артыкулаў, якія зьмяшчаюцца ў нашым пралетарскім друку.

Ударная брыгада; Зайчык, Вэнзэль, Ярашэвіч, Пустоціна, Тачыліна, Бандарэнка.

Менск.

Рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы ролі насьценнай газэты

У трамвайным парку амаль не выпускаецца насьценная газэта. Рэдкалегія распылілася. Некаторыя члены пашлі на перападрыхтоўку. Адказны рэдактар насьценнай газэты пашоў на вучобу і забраў з сабой увесь матар'ял газэты. З усіх членаў рэдкалегіі засталася толькі адна работніца Андрэева. Аднэй ёй цяжка выпусьціць газэту, бо парт'ячэйка і мясцком ёй не аказваюць ніякай дапамогі.

Яна зьвярнулася да старшыні мясцкому Чыгрынова з просьбай, каб ён пастараўся забраць матар'ял у былога рэдактара. Ён адмовіўся гэта зрабіць і параіў ёй шукаць былога рэдактара па Ленінскай вуліцы, бо ён там часта гуляе.

Насьценная газэта ў трамвайным парку выходзіць вельмі рэдка, вісіць яна ў такім месцы, што ніхто яе ня бачыць. Старшыня мясцкому нават ня лічыць патрэбным адказваць таварыш Андрэевай, калі яна зварачаецца да яго з пытаньнем аб насьценнай газэце.

Парт'ячэйка і мясцком павінны наладзіць работу насьценнай газэты ў самы бліжэйшы тэрмін. Такія адносіны з боку парт'ячэйкі і мясцкому да насьценнай газэты трэба кваліфікаваць, як правы апартунізм на практыцы.

Менск. А-ва.

Рабкор—ударнік, ударнік—рабкор

„Рабкор—ударнік, ударнік—рабкор“—
Па-вясеньняму сьпевам зьвініць.
Завод пяе, гук праз сізы прастор
Да кудравых калгасаў ляціць.
„Рабкор - ударнік, ударнік—рабкор“—
Па ўсім С-С-С-Р чуем мы.
Ніхто, ніхто ня спыніць шлях да зор,
Лёзунг наш на ўвесь сьвет прагрыміць.
Брыгада, зьвяно, калектыўны наш крок.
З кожным днём расьце новы атрад.
І там хутчэй разьлятаецца змрок,
Дзе ёсьць наступ ударных брыгад.
Хутчэй, сюды. Слухай кожны, што тут.
Гэта менскіх ударнікаў ліст.
Да ўсіх, да ўсіх, хто ўдарнік праз друк.
Прапанову сваю вынось.,
Зьвініць, зьвініць па ўсёй БССР
У адказ прапаноў ня зьлічыць.

Ударніцы часопісі „Беларуская работніца і сялянка“: зьлева напр•ва т. Розэнблюм, Барнбаум за апрацоўкай матар'ялу.

І я, гэта я рабселькор
Пяцігодку іду завяршыць.
Шчыльней рады, вось электра-агні,
Запрагайце электра-коняй.
Віхрам імчаць, папрабуй дагані.
Чаму тэмпы у нас—разумей.
„Рабкор—ударнік, ударнік—рабкор“—
Па-вясеньняму сьпевам зьвініць.
Усё пяе, гукі поўняць прастор.
Гэты сьпеў ўвесь сьвет абляціць.

В. Жураўлёва.

Работа з рабкорамі ажывілася

Наша рэдкалегія насьценнай газэты ўжо два разы склікала нарады насьценкораў. Пасьля нарады насьценкоры пачынаюць больш пісаць у насьценную газэту.

У сувязі з перавыбарамі рэдкалегіі складаюць у нас брыгады з насьценкораў для праверкі работы рэдкалегіі.

(„Чырв. тэкстыльшчык“.

Турына.

Ударная брыгада рабкорак часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ піджачнага цэху ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі“.

Становішча работніц у калёніяльных краінах

Капіталістычная рацыяналізацыя ў калёніяльных і паўкалёніяльных краінах будуецца выключна на ўзмоцненай эксплёатацыі працы. Зарплата работніц, якая за апошнія гады ўсё зьмяншаецца, складае палову зарплаты рабочага і ў 6—7 раз ніжэй зарплаты работніцы мэтраполій. Пры ўзмацненьні напружанасьці працы ідзе сыстэматычнае падаўжэньне рабочага дня да 14—16 гадзін.

Якія ўмовы жыцьця і работы гэтых сапраўдных рабынь капіталу? У Японіі і Кітаі прамыслоўцы наймаюць агентаў, якія разьяжджаюць па ўсёй краіне для вярбоўкі работніц. Агент у добрых фарбах малюе гарадзкое жыцьцё. Агент заключае дагавары з бацькамі завербаваных на вызначаны час і выдае сям'і невялічкую суму.

Пасьля прыезду ў горад, дзяўчат у Кітаі пасяляюць у агульным памяшканьні, адкуль яны без дазволу гаспадара ня маюць права адлучацца. Яны жывуць поўгалоднымі, іх бязьлітасна эксплёатуюць і зьдзекваюцца. Да сканчэньня тэрміну дагавору яны самі зарплаты за сваю работу не атрымліваюць. Прамыслоўца плаціць не работніцам, а агенту, які прывёз іх з вёскі.

І ў Японіі работніца знаходзіцца ў агульным памяшканьні, якое фактычна зьяўляецца для яе турмой. Толькі раз або два ў месяц яна можа пакінуць агульнае памяшканьне і то з дазволу адміністрацыі. Умовы ў агульных памяшканьнях надта брыдкія: адным і тым-жа ложкам карыстаюцца работніцы дзеннай і начной зьмены. Скучанасьць, сьпёртае паветра, цяжкая праца пры недастатковым харчаваньні вельмі хутка падрывае здароўе работніц і сухоты, як і іншыя заразьлівыя хваробы, уносяць штогод, тысячы маладых работніц.

У гэтых агульных памяшканьнях існуе самая ўтончаная форма вышуку. Як толькі ў якім небудзь кутку агульнага памяшканьня зьбіраюцца работніцы, каб пагутарыць аб парадках, якія пануюць на прадпрыемстве, як раптам нібы з пад зямлі вырастае наглядчыца, пад вокам якой работніцы знаходзяцца ўдзень і ўначы. За найменшае непаслушэнства накладаюцца штрафы.

У першыя месяцы работніца Японіі атрымлівае 3 іены, але звычайна сума штрафаў перавышае гэту мізэрную плату і большасьць работніц за ўвесь час свайго прабываньня ў агульным памяшканьні знаходзіцца ў даўгу ў прамыслоўцы. Калі работніца, ня вытрымаўшы гэтага праклятага жыцьця, прабуе ўцячы, дык прамыслоўца праз паліцыю пасяляе яе зноў на фабрыку.

У Кітаі, каб папасьці на фабрыку ня шляхам кантрактацыі, работніцы трэба прадставіць два паручыцельствы дамаўласьнікаў, крамнікаў, або іншых заможных людзей. Яна таксама павінна прайсьці мэдычны агляд і калі ножкі надта маленькія, ці на целе царапіна—у прыёме адмаўляюць. Асабліва прамыслоўцы настарожваюцца, калі даведаюцца, што работніца пісьменная. Пісьменнасьць служыць аднэй з вельмі сур'ёзных перашкод для атрыманьня работы.

На прадпрыемствах ушчыльненьне рабочага дня праводзіцца самым бязьлітасным парадкам. На шоўкапрадзільных фабрыках, дзе раней працавалі на адным варштаце, зараз працуюць на двух. Колькасьць шоўка-матальных варштатаў павялічылася да 16-ці на адну работніцу.

Дзякуючы інтэнсыфікацыі працы, адсутнасьці неабходных мер перасьцярогі, колькасьць няшчасных выпадкаў значна павысілася за апошні час. На працягу 1929 г. на 25 фабрыках з колькасьцю 18890 рабочых забіта на вытворчасьці 80 рабочых, а паранена 927. Звычайна прамыслоўцы не выдаюць ніякай дапамогі пацярпеўшым, ці іх сем'ям.

Адносіны майстроў, наглядчыкаў да работніц на фабрыках Кітаю самыя грубыя. Лаянка, пабоі, штрафы—звычайнае зьявішча. Перапынкаў на абед няма. Работніцы прыходзіцца есьці тайком, хаваючыся ад майстра. Бяда, калі апошні зловіць работніцу за ядой, аштрафуе і яшчэ нагой выбівае талерку з ядой.

Раней работніцам дазвалялася браць з сабой грудных дзяцей, цяпер гэта забаронена. Ніякай аховы працы ня існуе. Цяжарная работніца працуе да наступленьня радоў. Шмат выпадкаў, калі яна раджае ля варштату, ці ў фабрычнай уборнай ці нават на вуліцы.

Плаціць два даляры (кітайскі даляр—адзін руб.) за куток у агульным памяшканьні зьяўляецца недаступнай раскошшу для большасьці кітайскіх работніц. Звычайна яны будуюць сабе з саломы хібарку на пустыры за горадам, або жывуць у „джонках" (лодках) на рацэ.

Асабліва цяжка на фабрыках становішча дзяцей, якія на шоўкавых фабрыках складаюць адну чацьвёртую частку ўсіх занятых рабочых. У той час як дарослыя працуюць 12 гадзін, рабочы дзень для дзяцей—14 гадзін. Дарослыя пачынаюць працаваць з 5½ гадзін раніцы, а дзеці з 4½ гадзін. А дзеці працуюць ля кіпучых чанаў, куды кладуць коканы, і пакуль яны ня знойдуць канцоў шоўкаў, дарослыя ня могуць прыступіць да работы.

У найбольш прыгнечаным становішчы ў калёніях знаходзяцца работніцы — нэгрыцянкі. Для жыльля ім вызначаюцца спэцыяльныя раёны, як для зачумленых. У гэтых раёнах звычайна няма вады. Нэгрыцянкі - работніцы жывуць у напоўзруйнаваных хібарках. Плата за іх дасягае паловы іх заработку. У гэтых раёнах зусім няма школы для дзяцей.

У афрыканскіх калёніях жанчыны заняты таксама ва ўсіх цяжкіх вытворчасьцях. Яны выконваюць работу, якая патрабуе вялікай фізычнай напружанасьці. Яны працуюць у капальнях, у каменаломнях, на плянтацыях каўчука, у якасьці насільшчыкаў у караванах, грузчыкамі ў партовых гарадох. Працаваць прыходзіцца пад бізуном прыганятага, падпадаць цялесным карам, збойствам і штрафам. Тубыльныя рабочыя і работніца павінны заўсёды мець пры сабе спэцыяльны білет, пасьведчаньне.

Спробы ўцячы ад гэтых катаржных умоў караюцца турэмным зьняволеньнем. У турмах іх закоўваюць у кайданы, надзяваюць ашэйнікі.

І ў „цівілізаванай" Амэрыцы фактычна існуе прымусовая праца для рабочых і работніц—нэграў. У Паўднёвых штатах пры дапамозе арыштаў беспрацоўных на грунце законаў аб валацужніцтве, пры дапамозе арыштаў за даўгі і іншыя дробныя ўчынкі—капіталісты забясьпечваюць сябе таннай рабочай сілай. У шмат гарадох Паўднёвых штатаў затрыманыя за валацужніцтва нэгры складаюць каля 50 проц. усіх мясцовых рабочых.

Наблізіць да мас апарат спажывецкай каапэрацыі

Актыўным удзелам работніц, жонак рабочых і калгасьніц забясьпечым карэнную перабудову работы спажывецкай каапэрацыі

За апошні час партыя зварачае шмат увагі на пытаньні перабудовы і паляпшэньня працы спажывецкай каапэрацыі. Гэта выключная ўвага тлумачыцца тэй сур'ёзьнейшай роляй, якую спажывецкая каапэрацыя павінна адыграць у справе пасьпяховага ажыцьцяўленьня плянаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Тэмпы работы спажывецкай каапэрацыі да гэтага часу не адпавядаюць тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Бюракратызм, непаваротлівасьць апарату, пасылка тавараў у адны раёны за лік недасылкі ў другія—усё гэта ў значнай сваёй частцы тлумачыцца грамоздкасьцю апаратаў каапэрацыйных органаў. Каапэрацыя да сяго часу аб'яднала ў адным непасрэдным кіраўніцтве рад рознародных галін працы (грамадзкае харчаваньне, хлебапячэньне, прыгарадныя гаспадаркі і г. д.).

На падставе пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б была праведзена значная перабудова нізавой каапэрацыйнай сеткі. У гарадох пры найбольш буйных фабрыках і заводах арганізаваны самастойныя закрытыя рабочыя каапэратывы для абслугоўваньня асноўных прамысловых груп рабочых. Па лініі сельскай спажывецкай каапэрацыі арганізавана ў кожным сельсавеце спажывецкае таварыства замест існаваўшага раней аднаго раённага спажывецкага таварыства.

Аднак, карэннага паляпшэньня працы спажывецкай каапэрацыі мы яшчэ ня маем. Апошняя адозва ЦК УсеКП(б) СНК і Цэнтрасаюзу намячае карэнную перабудову цэнтральных кіруючых органаў спажывецкай каапэрацыі.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР прынялі пастанову аб рэарганізацыі апарату Белкаапсаюзу. Гэта рэарганізацыя ўносіць карэнны пералом ва ўсю працу спажывецкай каапэрацыі. Яна павінна зьнішчыць грамоздкасьць апарату каапэрацыі, стварыць яго больш гібкім, наблізіць да мас. У чым заключаецца гэта рэарганізацыя? Яна заключаецца ў тым, што пры Белкаапсаюзе ствараюцца самастойныя галінныя аб'яднаньні (трэсты)—гандлёвыя і вытворчыя, на гаспадарчым разрахунку з самастойным балянсам.

Напрыклад, арганізуецца аб'яднаньне па хлебапячэньні—„Белкаапхлеб", аб'яднаньне па прыгарадных гаспадарах—„Белкаапсельгас аб'яднаньне", гандлёвае аб'яднаньне—асобнае па гатовым адзеньні і тэкстылі,асобнае па абутку, асобнае па галянтарыі і трыкатажы і г. д. Арганізуецца спэцыяльнае галіннае аб'яднаньне па дзіцячым забесьпячэньні, якое павінна наладзіць абслугоўваньне дзяцей як дашкольнага, так і школьнага ўзросту. На чале кожнага аб'яднаньня павінен стаяць дырэктар. Гэтыя аб'яднаньні будуць мець сваю раздробную сетку.

Асаблівае значэньне набывае вылучэньне грамадзкага харчаваньня. Гэта павінна карэнным чы-



Унутраны выгляд Віцебскага панчошна-трыкатажнага камбінату.

нам палепшыць пастаноўку грамадзкага харчаваньня. Сэкцыя грамадзкага харчаваньня будзе мець сваё праўленьне, рэвізійную камісію, выбраныя на канфэрэнцыі членаў сэкцыі грамадзкага харчаваньня, якія зьяўляюцца пайшчыкамі спажывецкай каапэрацыі. Кожнай сталоўкай будзе кіраваць выбранае праўленьне сталоўкі, будзе выбрана свая рэвізійная камісія.

Правядзеньне ў жыцьцё пастаноў ЦК і СНК павінна паслужыць паваротным момантам у справе карэннай і рашучай перабудовы работы спажывецкай каапэрацыі тварам да індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны.

У выкананьні гэтых важнейшых пастаноў павінны прыняць удзел шырокія колы рабочых, работніц, калгасьнікаў і калгасьніц і ўсіх працоўных. Трэба яшчэ больш разгарнуць масавы рабочы кантроль над працай спажывецкай каапэрацыі.

Гінзбург.

Працяг артыкулу „Становішча работніц у калёніяльных краінах".

Дзяржава гэтых затрыманых „злачынцаў" прадастаўляе плянтатарам і капальняўласьнікам. Затрыманыя работніцы і рабочыя працуюць прыкаванымі да агульнага ланцугу.

У Злучаных Штатах Амэрыкі, якая вельмі ганарыцца сваёй культурай існуе і да гэтага часу сыстэма „джымкраізму", г. зн. асобныя вагоны для нэграў у цягнікох, трамваях, сталоўках, асобныя месцы ў тэатры і кінэ і г. д. Існуюць таксама кварталы для нэграў і пашпартныя падаткі. Часта здараецца, што белыя па падазронасьці ліньчуюць нэграў, г. зн. учыняюць над імі самасуд.

Работніца-нэгрыцянка, працуючы разам з белай работніцай, атрымлівае больш цяжкую працу, за якую ёй звычайна плацяць толькі палову зарплаты белай работніцы. Сотні тысяч нэгрыцянскіх дзяцей працуюць на плянтацыях, у прадпрыемствах, у доках, каменаломнях, рыкшамі, атрымліваючы за сваю цяжкую працу некалькі капеек у дзень.

З. Баярская.

Удзесецярыць тэмпы сяўбы—наша баявая задача

Веснавая сяўба праходзіць па БССР марудным тэмпамі. ЦК КП(б)Б прызнаў ход сяўбы нездавальняючым. Асаблівую пагрозу стварае слабае выкананьне плянаў сяўбы па ільне, каноплях і кармовых культурах. Аднэй з прычын слабага ходу сяўбы зьяўляецца тое, што яшчэ ня ўсе калгасы і саўгасы перайшлі на зьдзельшчыну, слаба арганізавана праца, асабліва сярод жанчын.

У некаторых калгасах адчуваецца рэзкі недахват рабочай сілы ў той час, як значная частка калгасьніц ня прымае ўдзелу ў палявых работах. У радзе калгасаў жанчыны ня прымаюць удзелу ў сацспаборніцтве і ўдарных брыгадах. Разам з гэтым калгасы, якія сваячасова ўлічылі ролю жаночай сілы ў веснавой сяўбе, маюць посьпехі. Мы падаем тут рад заметак, якія паказваюць, што ў выніку праведзенай работы з калгасьніцамі, жанчыны актыўна працуюць на полі, арганізуюць ударныя брыгады.

Дабіцца выхаду на работу ўсіх працаздольных калгасьніц—баявая задача веснавой сяўбы. Тут вялікая роля належыць дэлегаткам, яны павінны грамадзкім уплывам дабіцца выхаду на работу жанчын.

Слабы выхад на работу жанчын тлумачыцца і тым, што сетка бытавых устаноў сваячасова ня была разгорнута. Рад савецкіх і каапэрацыйных арганізацый і калгасаў недаацанілі гэтай важнай справы і марудзяць з арганізацыяй ясьляй і агульнага харчаваньня на час палявых работ. Гэты недахоп неабходна тэрмінова выправіць, дабіцца, каб уся сетка намечаных у саўгасах і калгасах ясьляй была адкрыта. Гэта значна павялічыць колькасьць рабочых рук, якія патрэбны для догляду пасеваў і ўборкі ўраджаю.

Неабходна зьнішчыць тыя рагаткі, якія перашкаджаюць адкрыцьцю ясьляй. Адміністрацыя саўгасаў і праўленьні калгасаў павінны забясьпечыць ясьлі памяшканьнем. Калі гэтых памяшканьняў не хапае, можна скарыстаць хату каго-небудзь з калгасьнікаў, нарэшце, пабудаваць часова летняга тыпу будынак з дошак. Каапэрацыя павінна дапамагчы ў абсталяваньні ясьляй.

У гэтай справе важна самадзейнасьць саміх калгасьніц. Адкрыцьцё ясьляй ня можа затрымлівацца з тэй прычыны, што не хапае прадуктаў. Дзеці дома харчуюцца, значыць, пры самадзейнасьці калгасьніц можна сабраць прадукты, якіх не хапае ясьлям за кошт саміх калгасьнікаў.

Пасьпяховым правядзеньнем сяўбы дамо рашучы адпор спробам кулацтва затрымаць наша сацыялістычнае будаўніцтва.

Таварыш Віслаухава пабальшавіцку выканала ўзяты на сябе абавязак

Да міжнароднага камуністычнага жаночага дня бяднячка-актывістка Віслаухава ўзяла на сябе абавязак арганізаваць калгас імя 8 сакавіка. Тав. Віслаухава актыўна ўзялася за працу. Яна правяла некалькі сходаў. Некаторыя аднаасобнікі рабілі нападкі на Віслаухаву, але яна сваёй працы ня спыняла.

І вось 16-га мая ў вёсцы Прудзіны быў арганізаваны калгас імя 8 га сакавіка, у склад якога ўвайшлі 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Усе дэлегаткі гэтага вучастку ўступілі ў калгас. Асабліва актыўны ўдзел у арганізацыі калгасу прымалі **Віслаухава, Хацькова і Ўраднікава.** Усе яны выбраны ў праўленьне і рэвізійную камісію калгасу.

Аднаасобніца Волкава, ня гледзячы на тое, што бацька і брат не ўвайшлі ў калгас, адна з першых увайшла ў калгас і ўцягнула за сабой іншых жанчын.

Праз тыдзень у калгас імя 8-га сакавіка ўлілося яшчэ 7 гаспадарак і на сёнешні дзень налічваецца 19 гаспадарак.

Межынскі раён.

Гіліна.

Веснавая сяўба будзе з посьпехам праведзена

Калгас „Чырвоны араты“ налічвае зараз 40 гаспадарак. На тэрыторыі калгасу разгорнута прамысловае будаўніцтва цэмэнтнага і фасфарытнага заводаў і чыгуначнай станцыі і шмат колгасьнікаў працуюць на вытворчасьці.

У калгасе адчуваецца востры недахват рабочай сілы. Каб выйсьці з гэтага становішча, дэлегаткі вышлі пры першым выезьдзе ў поле араць калгасныя палі разам з калгасьнікамі. Увесь час яны працуюць. Дэлегаткі дапамаглі ліквідаваць абязьлічку, за кожным колгасьнікам замацован інвэнтар, за які ён адказвае

Працуючы зьдзельна, калгасьніцы-дэлегаткі нават перавышаюць свае нормы. 10 калгасьніц раскідалі ў дзень 200 вазоў гною.

Але ёсьць часта дэлегатак у асаблівасьці жонкі служачых,



Пасадка бульбы ў калгасе імя Сталіна Вузьдзенскага раёну.

якія абвясьцілі сябе ўдарніцамі, але ніякай дапамогі яны не аказваюць калгасу.

Мы, ударніцы калгасу „Чырвоны араты“, заклікаем вас выканаць свае абавязацельствы. Таварыш Савіцкая, Калбяцова і Галіцкая, вы павінны стаць сапраўднымі ўдарніцамі, а ня ўдарніцамі на паперы.

Мы заклікаем калгасьніц іншых калгасаў Крычаўшчыны пасьледваць нашаму прыкладу і стаць актыўнымі змагарамі за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы, за ўцягненьне ў калгасы.

Крычаўскі раён.

Дэлегатка.

Па-ўдарнаму да тэрміну скончым сяўбу

Веснавая сяўба ў калгасе „Беларуская вёска“ праходзіць шпаркім тэмпам. На 3 мая засеяна было 42 проц. усёй плошчы, да 5-га чэрвеня калгасьнікі мяркуюць скончыць веснавую сяўбу.

Колгасьніцы Хацько Акуліна, Міронава Хвядора і калгасьнікі Міронаў Іван, Сядзель Дзяніс, Сяўдзель Аўдзей працуюць па-ўдарнаму. Ніколі ня робяць прагулаў, выконваюць і перавыконваюць нормы сваёй выпрацоўкі.

Калгасьніца Гарэлік Хвядора і калгасьнікі Сьляпец Захар'я, Зуп Ліп'яда часта адмаўляюцца ад працы. Яны атрымалі вымову ад праўленьня і агульнага сходу калгасьнікаў.

Добра працуе праўленьне калгасу. Кантрактацыя розных культур ужо праведзена.

Капаткевіцкі раён.

Званковіч.

Зьдзельшчына выклікае прыліў у калгас

Калгас **„Іскра“** першы ідзе па сяўбе ў Бяседавіцкім сельсавеце. 35 проц. калгасьнікаў ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Калгасьніцы пры дапамозе камсамольцаў арганізавалі дзьве жаночыя брыгады, паміж якімі заключан дагавор на лепшае правядзеньне сяўбы. Калгасьнікі амаль адмовіліся ад выходных дзён і рэлігійных сьвят.

У калгасе з вялікім посьпехам ужываецца зьдзельшчына. Гэта выклікае новы прыліў у калгас. Кожны дзень паступаюць новыя заявы. 18 мая падана 5 заяў.

Хоцімскі раён.

Лупікава Ніна.

Тав. Вішамірская — ударніца саўгасу „Кухцічы“, Вузьдзенскага раёну за ўдарную работу прэміявана.

За актыўную работу ў правядзеньні пасеўнай кампаніі занесены на чырвоную дошку

Дэлегаткі Каменскага сельсавету тав. **Цярэшка Ганна і Цярэшка Волька** першыя запісаліся ў калгас і ўцягвалі за сабой іншыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Гэтыя дэлегаткі прымалі вельмі актыўны ўдзел у веснавой пасеўнай кампаніі.

Зараз сельсавет калектывізаван на 64 проц.

Прэзыдыум сельсавету пастанавіў тав. Цярэшку Ганну і Цярэшку Вольку занесьці на чырвоную дошку. **Шымук.**

Вузьдзенскі раён.

Дэлегаткі дапамагаюць правядзеньню сяўбы

Дэлегаткі **Буда-Кашалёўскага** вясковага і транспартнага дэлегацкага сходу ў ліку 40 чалавек на куставым сходзе дэлегатак распаўсюдзілі пазыкі „пяцігодка—за чатыры гады“ на суму 105 р.

Заслухаўшы інфармацыю, што калгас „Гром“ адстае ў веснавой сяўбе, яны пастанавілі наладзіць суботнік на дапамогу калгасу. 16 дэлегатак працавалі па-ўдарнаму. Яны пасадзілі два гектары бульбы і разьбілі 60 вазоў гною.

Пасьля работы дэлегаткі наладзілі гутарку з калгасьнікамі і калгасьніцамі. Адзначылі тыя недахопы, якія яны заўважылі ў калгасе, што перашкаджае правядзеньню веснавой сяўбы.

Буда-Кашалёўскі раён.

Шыбко.

У першых радох веснавой сяўбы

У калгасе „Полымя“, Рогаўскага сельсавету, сяўба ідзе шпаркімі ўдарнымі тэмпамі. Жанчыны ў працы прымаюць актыўны ўдзел. Створаныя ўдарныя брыгады, асабліва з жанчын, выклікалі на сацспаборніцтва па веснавой сяўбе калгас імя 16-га зьезду УсеКП(б), Шаршунскага сельсавету.

Дзякуючы ўдарніцтву, калгас імя „Полымя“ ў выкананьні пасеўнага пляну стаіць амаль на першым месцы па раёну. Пляны аўса, пшаніцы і ячменю перавыкананы. Застаецца закончыць сяўбу бульбы, ільну і іншых культур. Зараз важнейшая задача ўсіх калгасьнікаў — закончыць сяўбу першымі па Заслаўскім раёне, у вызначаны тэрмін засеяць плошчу ў 532 *га* і пачаць рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. **М. Жукоўская.**

Заслаўскі раён.

Затраўка сусьлікавых нор на палёх калгасьнікаў.

Паскорым разгортваньне бытавых устаноў. Даб'емся выхаду ўсіх працаздольных калгасьніц на працу

Падрыхтаваць ясьлі і пляцоўкі

Арганізацыю дзіцячых ясьляй па Заслаўскім раёне амаль што сарвалі. Вельмі мала адкрылі ясьляй, дый тыя позна ў той час, як канчаецца сяўба. У саўгасе „Беларусь" і калгасе „Фрунзэ" былі намечаны дзіцячыя ясьлі, але яны і на сёнешні дзень яшчэ не адкрыты, бо няма памяшканьня. Тое-ж самае зьявішча мы маем ў калгасе „Кім" і іншых калгасах і саўгасах. Раённыя арганізацыі не зварачалі ўвагі на гэта важнае пытаньне.

Каб папярэдзіць прарыў уборачнай кампаніі, раённыя арганізацыі павінны зараз-ж пачаць падрыхтоўку да арганізацыі дзіцячых ясьляй і пляцовак ва ўжо вызначаныя саўгасы і калгасы. Дырэктары саўгасаў, праўленьні калгасаў павінны адвесьці памяшканьні для ясьляй і пляцовак і толькі тады мы вырашым пытаньне з рабочай сілай.

Заслаўскі раён.

Русовіч.

Вызваліць жаночыя рабочыя рукі для палявых работ

Ахматмлад пастанавіў да веснавой сяўбы адкрыць ясьлі пры саўгасе „Камаровічы". Была вылучана загадчыца ясьляй, але тормазам зьяўляеца адсутнасьць памяшканьня. Сяўба ў поўным разгары, а жонкі рабочых ня ведаюць, куды дзець дзіця. Жаночых рабочых рук у саўгасе не хапае, а несваячасовае адчыненьне ясьляй затрымлівае больш 20 жанчын.

У той час, як вучні школы ўзяліся ліквідаваць прарыў, жонка аднаго рабочага саўгасу, дачка кулака Паўкалава Н., заявіла: „лепш буду паўгалоднай, а на чорную работу не пайду". Гэтаму варожаму выступленьню трэба даць належны адпор.

Трэба як найхутчэй знайсьці памяшканьне для ясьляй і прыцягнуць вінаватага, які перашкаджае адчыненьню ясьляй, да адказнасьці.

Пятрыкоўскі раён.

Жанчына.

Сарвалі адкрыцьцё ясьляй

Праўленьне калгасу „Камсамолец" намеціла адкрыць ясьлі да веснавой сяўбы. Адну калгасьніцу паслалі на курсы загадчыц ясьляй.

Калгасьніцы ўнесьлі грошы на пабудову ясьляй у разьмеры 10 руб., але адкрыцьцё ясьляй ледзь не сарвалася з-за дзіцячых ложкаў. Загадчыца ясьляй і старшыня калгасу знайшлі памяшканьне і зрабілі ложкі, а ясьлі ўсё-ж не адкрываюцца, бо капэрацыя не выдае мануфактуры, місак, кубкаў і г. д.



Перабіраюць бульбу з капцоў. Калгас „Кухцічы".

Апрача гэтага цяжка знайсьці кіраўніка для ясьляй. Загадчыца зьвярнулася да інспэктара нарасьветы, а ён накіроўвае яе да інспэктара аховы здароўя, апошні ў іншыя ўстановы. Так загадчыца ходзіць з аднэй установы ў другую, а вынікаў няма.

Тым часам калгасьніцы ня ідуць на работу, бо няма дзе пакінуць дзяцей.

Належным органам трэба заняцца гэтым пытаньнем і чым хутчэй яго вырашыць.

Глускі раён.

Верны.

Неабходна пашырыць сетку ясьляй

У Чэрвеньскім раёне былі арганізаваны 6-тыднёвыя курсы па падрыхтоўцы кадраў для ясьляй. Гэтыя курсы скончылі 32 чалавекі, 11 работніц саўгасу і 21 калгасьніца. Па ўсім раёне арганізавана 26 ясьляй у той час, як мы маем 51 калектыўную гаспадарку. Гэта лічба зьяўляецца зусім малой. Ясьлі неабходна было-б арганізаваць ва ўсіх буйных калектыўных гаспадарках.

Партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі павінны зьвярнуць больш увагі на гэта пытаньне. Саўгасы і калгасы павінны вылучаць для гэтай мэты грашовыя фонды для арганізацыі ясьляй.

Чэрвеньскі раён. **Кубліна.**

Павітухі калечаць жанчын

У Кашчынскім сельсавеце ў вёсцы Цытра жыве Дзянісевіч Тэкля, якую ўсе называюць бабка Фёдарыха. Гэта бабка зьяўляецца павітухай, яна бывае пры родах і робіць аборты. Сустракаючы жанчын розных вёсак, яна ім прапануе ў патрэбны час сваю „дапамогу". Многіх яна сваёй дапамогай пакалечыла, а многія праз яе памерлі.

Аднаго разу да бабкі Фёдарыхі зьвярнулася адна цяжарная дзяўчына, бо ісьці да доктара яна саромелася. Бабка Фёдарыха за 15 мэтраў палатна, сала і грошы ўзялася зрабіць аборт. З гэтай мэтай яна загнала запалку ў шыйку маткі. Але страшэнныя болі і моцны крывацёк прымусілі дзяўчыну зьвярнуцца да доктара. Хворую ледзь удалося адратаваць.

Працоўныя жанчыны павінны добра памятаць, што „дапамога" бабкі азначае верную сьмерць.

У патрэбны час працоўныя жанчыны павінны зварачацца толькі да доктара і да акушэркі.

Халопеніцкі раён.

Караваева.

Ажывіць работу

У г. Гарадку не праводзіцца ніякай работы сярод жанчын. Дэлегацкія сходы не працуюць Дэлегатак ня ўцягваюць у грамадзкую работу. Трэба адзначыць, што партыйная ячэйка не забясьпечыла дэлегацкага сходу пастаянным кіраўніком. Д.

За бальшавіцкай сяўбой—
бальшавіцкая ўборка

Калгас „Энгельс", Уваравіцкага раёну. Раздача літаратуры ў полі.

Больш двухсот тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, аб'яднаўшыся ў калгасы, праводзяць веснавую сяўбу калектыўна. Ужо ў весну гэтага году пасеўная плошча яравых у калгасах складае 832 тысячы *га*. Значна павялічыўся засеў тэхнічных і працаёмкіх культур. Гэтыя посьпехі ў справе калектывізацыі і веснавой сяўбы трэба замацаваць найлепшым правядзеньнем уборачнай кампаніі. Таму перад усімі калгасамі, кожным калгасьнікам і калгасьніцай стаіць баявая задача—ня толькі па-бальшавіцку засеяць, але і па-бальшавіцку сабраць ўраджай. Трэба памятаць, што ў гэтым годзе з-за кліматычных умоў позна пачалася сяўба і тым самым скарачаюцца тэрміны догляду ўраджаю і падрыхтоўкі да ўборкі. Уборачная кампанія мінулага году павінна таксама паслужыць нам урокам: у асобных калгасах з-за несвоечасовай і дрэннай работы частка ўраджаю засталася няўбранай.

У гэтым годзе мы павінны так наладзіць работу, каб убраць з палёў усю прадукцыю без якіхбы там ні было страт. Пасьпяховае выкананьне пляну ўборкі залежыць галоўным чынам ад правільнай арганізацыі працы ў кожным калгасе шляхам стварэньня ўдарных брыгад і сацспаборніцтва, правільнага і поўнага скарыстаньня існуючых уборачных машын і цягавай сілы.

Важнае значэньне ў справе павышэньня ўраджайнасьці набывае работа па доглядзе пасеваў. Для нармальнага разьвіцьця ўсіх пасеваў і падняцьця ўраджайнасьці неабходна ў часе веснавога і летняга пэрыядаў ужываньне раду агранамічна-культурных мерапрыемстваў. Усе калгасы павінны ўключыць у сваю вытворчую праграму поліва гародаў, кармовых кораньплодаў, ільну і канапель, а таксама баранаваньне і абворваньне бульбы, для чаго скласьці каляндарныя пляны работ.

Работы па доглядзе пасеваў трэба своечасова праводзіць, бо ўсякае спазьненьне выклікае вялікія страты. Для гэтага неабходна своечасова падрыхтаваць інвэнтар, патрэбны для поліва і міжрадковай апрацоўкі. Трэба таксама падрыхтавацца і арганізаваць работу па барацьбе са шкоднікамі палявых пасеваў, гародаў і садоў.

Асаблівую ўвагу трэба аддаць уборцы траў кораньплодаў і сіласаваньню кармоў. Як правіла, заліўныя лугі трэба два разы касіць. Саўгасы і калгасы поўнасьцю павінны выканаць свой плян сіласаваньня. Апрача сіласных культур павінны быць скарыстаны і засіласаваны ўсе адкіды, якія ёсьць у гаспадарцы.

У гэтым годзе значная частка ўраджаю калгасаў будзе ўбірацца складанымі машынамі. Таму неабходна, каб усе машыны, якія ёсьць у калгасах, былі своечасова адрамантаваны і забясьпечаны запаснымі часткамі. Трэба, каб у часе ўборкі ўсе машыны максымальна былі загружаны работай. У мэтах поўнага скарыстаньня машын на рабоце трэба арганізаваць дапамогу аднаго калгасу другому і саўгасу калгасу. Трэба зьнішчыць абязьлічку і чаргаваньне працы на машынах, неабходна павесьці рашучую барацьбу з паломкамі і нядбайнымі адносінамі да машыны.

Вялікае значэньне ў часе ўборкі збожжа і іншых культур мае транспарт. Таму ўсе калгасы павінны своечасова паклапаціцца і да пачатку ўборкі прывесьці ў поўную гатоўнасьць увесь транспарт. Праўленьням калгасаў трэба загадзя дагаварыцца з загатоўчымі арганізацыямі аб пунктах здачы закантрактаванай прадукцыі з тым, каб можна было здаваць прадукцыю непасрэдна на пункт, скарачаючы гэтым самым непатрэбныя перавозкі.

Калгасы павінны паказаць прыклады поўнай і своечасовай здачы (праданай) таварнай часткі сельска-гаспадарчай прадукцыі на 1931 год. Вялікае значэньне мае пытаньне забесьпячэньня памяшканьнем усяго ўраджаю і асабліва насенных і фуражных фондаў. У кожным калгасе павінны быць намечаны і адведзены памяшканьні і наладжан улік і захаваньне складзенага ў гэтых памяшканьнях ураджаю.

Усе работы па міжрадковай апрацоўцы, змаганьні са шкоднікамі сельска-гаспадарчых расьлін, поліве, сенакашэньні, сіласаваньні, уборцы збожжа, тэхнічных культур павінны быць пераведзены на зьдзельшчыну. На ўсіх асноўных работах па ўборцы, абмалоце і пасеву павінна ўжывацца брыгадная сыстэма. Кожная брыгада павінна мець пэўныя заданьні і тэрмін выкананьня работ. Неабходна наладзіць ва ўсіх калгасах ўлік работы ў працаднёх. Патрэбна ўлічваць ня толькі колькасьць працы, але і якасьць яе. У кожным калгасе павінны быць вылучаны прэміяльныя фонды для прэміяваньня кальгасьнікаў і калгасьніц—ударнікаў, якія добра выконваюць работу.

У мэтах поўнага выкарыстаньня ўсёй працоўнай сілы, якая ёсьць ў калгасе, і асабліва жаночай, патрэбна арганізаваць на час уборкі дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі і агульнае харчаваньне.

У часе ўборачнай кампаніі прыдзецца весьці некалькі работ, таму асаблівае значэньне мае складаньне рабочых плянаў уборкі, у якіх павінны быць указаны аб'ём работы, тэрміны выкананьня, нормы выпрацоўкі.

Уборачная кампанія павінна замацаваць посьпехі пасеўнай і спрыяць шырокаму прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. У часе ўборкі, як і ў часе веснавой сяўбы, кулак будзе змагацца супроць калгасаў, ён будзе старацца сарваць працоўную дысцыпліну ў калгасах, каб гэтым самым дабіцца пагібелі часткі калгаснага ўраджаю. Гэтай рабоце павінен быць даць самы рашучы адпор.

Прыкладнай работай, павялічэньнем ураджаю ў калгасах калгасьніцы павінны паказаць усёй масе беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў перавагу калектыўнай працы.

Баявымі тэмпамі за бальшавіцкую ўборачную кампанію.

Ударніцы-калгасьніцы, наперад! **А. Залескі.**

Ударніцы-рабкоркі ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі“: зьлева направа тав. Бэдынэрман, тав. Гонікман, тав. Глазковіч.

Работніца павінн рацьбе за якасьць дукцыйнасьці пра

РЭЙД РАБКОРАК-у

Шырэй разгарнуць работу па сацспаборніцтву і ўдарніцтву

На акулярнай фабрыцы працуюць 713 работніц, што складае амаль 47 проц. да агульнага ліку рабочых.

Ня ўсе работніцы ўцягнуты ў сацыялістычныя мэтады працы. Ва ўдарныя рады ўцягнуты ўсяго 287 работніц. Большая частка ўдарніц працуюць ва ўдарных брыгадах. Толькі 28 ударніц аб‘ядналіся ў вытворчую камуну і нязначная частка ўдарніц працуюць індывідуальна.

Уцягненьне работніц ва ўдарныя брыгады і ахоп іх сацспаборніцтвам у нас стаіць не на належнай вышыні. Ні партячэйка, ні фабком не аддаюць належнай увагі такому важнаму пытаньню і таму на нашай фабрыцы няма росту ўдарных брыгад. Нават тыя ўдарныя брыгады, якія былі арганізаваны і значна павысілі прадукцыйнасьць сваёй працы, разваліліся з пераходам у новы корпус. Большая частка віны прыпадае на рацыяналізатарскае бюро і таксама на інструктара зборачнага цэху прадахавальнага аддзяленьня тав. Розэнфэльд, якія раскінулі брыгадзірак па розных работах. Работніцы-ўдарніцы ўказвалі, што гэтага ня трэба рабіць, а трэба з гэтымі брыгадамі наладзіць паточную сыстэму. З заўвагамі работніц ня лічыліся ні рацыяналізатарскае бюро, ні інструктар. Пасьля гэтага прышлося зноў ўзяцца за арганізацыю ўдарных брыгад.

На фабрыцы няма ўліку эфэктнасьці ўдарных брыгад і невядома як яны выконваюць свой прамфінплян. Прамфінплян не даведзен да варштату. Ударніцы ня ведаюць сколькі ім трэба зрабіць, каб выканаць сваю норму.

Пры пераглядзе норм выпрацоўкі некаторыя брыгады, як

Па праверцы ўдзелу работніц у сацыялістычным спаборніцтве часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ правяла рэйд ударніц друку гор. Віцебску.

Матар‘ялы рэйду ясна паказваюць, што работніцы-ўдарніцы зьяўляюцца пачынальніцамі ў выкананьні прамфінпляну ў высоўваньні сустрэчных плянаў. Прыкладам можа служыць 8-ая моладзьная істужка бручнага цэху швэйнай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“, якая ў пераважнай большасьці складаецца з жанчын. Работніцы-ўдарніцы гэтай істужкі зьяўляюцца сапраўднымі энтузіястамі сацыялістычнай працы. Яны ня толькі выконваюць у якасных і колькасных адносінах свой сустрэчны плян, але перавыконваюць яго. Тое-ж самае мы маем і на акулярнай фабрыцы. Жаночыя ўдарныя брыгады значна павысілі нормы сваёй выпрацоўкі.

У той-жа час рэйд высьветліў, што ўдзел работніц у сацыялістычных формах працы зьяўляецца невыстарчальным. На фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі“ сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам не ахоплены ўсе работніцы. Ударніцы складаюць 57 проц. агульнага ліку ўдарнікаў у той час, як на фабрыцы пераважная большасьць—работніцы. Гэта тлумачыцца тым, што слаба разгорнута растлумачальная работа па гэтым пытаньні.

Ударніцы часопісі, праводзячы рэйд, адначасова разгарнулі растлумачальную работу сярод работніц і на працягу двух дзён завербавалі 47 работніц ва ўдарныя рады.

Яшчэ горш з гэтым пытаньнем на акулярнай фабрыцы. З ліку 713 работніц ударніцтвам і сацспаборніцтвам ахоплены толькі 287 работніц. Гэта сьведчыць аб тым, што „трыкутнік“ фабрыкі ня кіруе, што ўцягненьне работніц ва ўдарныя брыгады праходзіць самацёкам і таму зразумела няма росту ўдарных брыгад. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. „Трыкутнік“ акулярнай фабрыкі павінен зараз-жа наладзіць кіраўніцтва. Ні адна работніца не павінна быць па-за радамі ўдарных брыгад.

Рэйд ударніц друку сыгналізуе, што вельмі дрэнная справа з вылучэньнем работніц-ударніц на кваліфікаваную работу і з аўладаньнем тэхнікай сваёй вытворчасьці.

На „Сьцягу індустрыялізацыі“, дзе работніцы складаюць 70 проц. агульнага ліку рабочых, іх мала вылучаюць на кваліфікаваную работу. У закройным цэху і прыёмачнай зусім няма работніц, гэта зьяўляецца ненармальным зьявішчам. Да гэтага часу няма жанчыны загадчыка цэхам ці намесьніка ў той час, як на фабрыцы ёсьць шмат старых кваліфікаваных работніц. Яны сядзяць на маленькіх апэрацыях. „Трыкутнік“ фабрыкі, як відаць, зусім забыў пастанову ЦК КП(б)Б аб вылучэньні жанчын на кваліфікаваную работу.

Акулярная фабрыка і „Сьцяг індустрыялізацыі“ мала павярнуліся да пытаньня аўладаць тэхнікай. Тэхнічныя гурткі існуюць на паперы, заняткаў яшчэ не распачалі

Партыйным і прафэсіянальным арганізацыям гэтых фабрык трэба рашуча ўзяцца за зьнішчэньне недахопаў, высьветленых брыгадамі нашай часопісі.

На быць пачынальніцай у ба-
прадукцыі, за падняцьце пра-
цы, за зьніжэньне сабекошту

КУДАРНІЦ г. ВІЦЕБСКУ

Тав. Рот—вылучэнка-работніца, намесьнік дырэктара „Сьцяг індустрыялізацыі"

брыгада Бабковай, Нэплах, 8-га сакавіка ў машынным цэху і адна брыгада штамповачнага цэху, высунулі сустрэчныя пляны і добра спраўляюцца. Саццагавары заключаны паміж брыгадамі, але ніхто іх на працягу цэлага году не правяраў. Вельмі слаба павышаецца якасьць прадукцыі.

Пры прапрацоўцы адозвы Тульскіх рабочых на фабрыцы былі арганізаваны чатыры брыгады імя „518". Шмат работніц замацавалі сябе на фабрыцы да канца пяцігодкі, але ў гэтай справе вельмі дрэнна наладжан вучот.

Няважна стаіць з пытаньнем „аўладаць тэхнікай". Ніякіх тэхнічных гурткоў у нас няма і таму работніцы, ня ведаючы тэхнікі сваёй вытворчасьці, ня могуць прымаць належнага ўдзелу ў рацыяналізатарскай рабоце. Усяго 9 работніц унесьлі рацыяналізатарскія прапановы. З іх 4 работніцы тав. **Лерман, Голубева, Шчуплік і Цвэй** былі прэміяваны за каштоўныя прапановы.

Актыўнасьць работніц усё павышаецца. Мы лічым, што грамадзкія арганізацыі фабрыкі павінны зьнішчыць усе ненармальныя зьявішчы, яны павінны ўцягнуць усіх работніц і рабочых у сацыялістычныя мэтады працы.

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка": Андрэева, Голубева, Бабкова, Нэплах, Піруціна, Герасімава.

Віцебск.

Вылучыць жанчын на кваліфікаваную работу

Швэйная фабрыка **„Сьцяг індустрыялізацыі"** зьяўляецца самай буйнай швэйнай фабрыкай у БССР. Яна ўступіла ў сьнежані 1930 году. З пачатку пачала працаваць толькі частка бручнага цэху. У сакавіку большая частка фабрыкі пушчана ў ход.

Фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі" пабудавана па апошнім слове тэхнікі. Вялікія вокны і шкляны дах даюць шмат сьвятла, вялізарныя цэхі ствараюць добрыя ўмовы для працы. Уся фабрыка нагадвае сабою палац працы. Фабрыка вырабляе выключна мужчынскую вопратку: штаны, піджакі. Яна налічвае 3200 рабочых, але лік рабочых будзе значна павялічан, бо ў ліпені будуць пушчаны ў ход яшчэ дзьве істужкі, адна піджачная, а другая для мужчынскіх польтаў.

Работніцы складаюць 70 проц. агульнага ліку рабочых. Яны слаба ўцягнуты ва ўдарныя брыгады і не ахоплены сацспаборніцтвам. Жанчыны - работніцы складаюць усяго 57 проц. агульнага ліку ўдарнікаў. На фабрыцы існуе 12 жаночых брыгад і да 1 мая арганізавалася жаночая камуна гузічніц. Прадукцыйнасьць працы работніц гэтай камуны значна павысілася, але камуна зьяўляецца адзінай па ўсёй фабрыцы.

Асобныя вучасткі заключылі паміж сабой сацыялістычныя дагавары. Да дня гадавіны была праведзена праверка гэтых дагавароў, але трэба адзначыць, што штодзеннай праверкі ў нас не праводзіцца.

Адозва тульскіх рабочых была прапрацавана работніцамі нашай фабрыкі. У выніку гэтага прадукцыйнасьць працы значна павысілася. Калі ў першым кварталe прамфінплян быў выканан на 68 проц., у красавіку на 94,2 проц. то першая дэкада мая паказвае 109,3 проц.

Работніцы і рабочыя „Сьцяга індустрыялізацыі" далучыліся да прапановы аб выпуску пазыкі „3-ці рашаючы год" і ўжо падпісаліся на 75 тысяч рублёў.

У выкананьні прамфінпляну работніцы ў параўнаньні з рабочымі не адстаюць. Прыкладам можа служыць 8-я моладзьная істужка бручнага цэху, якая ў пераважнай большасьці складаецца з работніц. Гэта істужка ў студзені выканала прамфінплян на 93,8 проц. у сакавіку—113,6 проц., у красавіку—104,3, у першай дэкадзе мая—108,8 проц. Цікава тое, што за 15 хвілін да пачатку работы адбываецца агульны сход 8-ай істужкі і яны вызначаюць, колькі неабходна сёньня выпусьціць штаноў. Такім чынам яны кожны дзень выстаўляюць свой сустрэчны плян і выконваюць яго ў якасных і колькасных паказальніках.

Надта слабы ўдзел прымаюць работніцы ў рацыяналізатарскай рабоце. За ўвесь час 5 работніц унесьлі прапановы, з іх скарыстаны была адна. Гэта тлумачыцца тым, што работніцы мала ўцягнуты ў тэхнічныя гурткі.

Трэба адзначыць, што на фабрыцы тэхнічныя гурткі створаны, але да гэтага яны не прыступілі да заняткаў. Неабходна, каб кожная работніца была ўцягнута ў гурткі і вывучала-б тэхніку сваёй вытворчасьці.

Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы большасьць работніц, мы маем такое зьявішча, калі ў закройным цэху няма ніводнай жанчыны. Жанчын не вылучаюць у закройны цэх, матывуючы тым, што быццам-бы адна работніца калісьці адрэзала сабе палец. Тое-ж самае можна заўважыць і ў прыёмачнай. Адна работніца вылучана намесьнікам дырэктара па рабочых прапановах і 5 работніц у якасьці інструктароў. Да гэтага часу ніхто з работніц ня вылучан загадчыкам цэхаў і намесьніком. Наогул жанчын мала вылучаюць на кваліфікаваную работу ў той час, як на фабрыцы мы маем шмат старых кваліфікаваных работніц. „Трыкутніку" нашай фабрыкі неабходна заняцца

Ні аднэй работніцы па-за радамі ўдарных брыгад

Праверка радоў ударнікаў дапамагла выкананьню прамфінпляну

Пасьля праверкі складу ўдарнікаў, частка ударнікаў падцягнулася. Тыя, хто ў часе праверкі і раней ня выконвалі прамфінплян (напрыклад, работніца Ігнацьцева часова выключана з радоў ударнікаў), пачалі яго выконваць Такіх канфэрэнцыя ўдарнікаў парашыла пакінуць у радох ударнікаў.

„Чырв. тэкстыльшьык".

Турына.

Будзем змагацца за бальшавіцкія тэмпы

На вытворчай нарадзе ў прадахавальным цэху аднэй зьмены загадчык цэху ў ружовых фарбах абмаляваў становішча нашага цэху. Ён спыніўся на тым, што прадукцыйнасьць працы на машынах паднялася на 100 проц., а ручная праца—на 60 проц., але ён мала спыняўся на хваравітых бакох. Работніцы яго даклад моцна крытыкавалі. Яны ў сваіх выступленьнях даказалі, што несваячасова падаецца матар'ял для працы, што работніцы павысілі прадукцыйнасьць сваёй працы, узьнялі працдысцыпліну, але адміністрацыя робіць затрыманьні ў рабоце.

Ударніцы заявілі на гэтай нарадзе, што яны будуць змагацца за бальшавіцкія тэмпы ў сваім цэху.

Віцебск.
Акул. фабр.

Андрэева.

Тав. Капялевіч—прэміяваная ўдарніца бручнага цэху швэйнай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі".

Дзякуючы ўвядзеньню тэхкантролю якасьць у мэханічным цэху палепшылася

За апошні час на нашым заводзе палепшылася якасьць прадукцыі, асабліва па мэханічным і зборачным цэхах. Гэта таму, што ў гэтых цэхах быў вызначан тэхнічны кантроль, які ставіў сабе мэту паляпшэньня якасьці прадукцыі ў мэблевых цэхах. Уся праца праходзіла пад праверкай тэхнічнага кантролю, дрэнная якасьць бракуецца і не прапускаецца ў зборку, але ёсьць яшчэ паасобныя выпадкі, калі ня ўсе працаўнікі тэхнічнага кантролю добрасумленна і акуратна адносяцца да сваёй працы. Бывае, што якасьць не праходзіць праз кантроль.

Яхновіч.

Завод „Дрэваапрацоўнік".

Палепшылася бытавое абслугоўваньне фабрыкі „Кастрычнік"

Бытавыя ўмовы нашых работніц значна палепшыліся. З 1-га чэрвеня адкрываецца дзіцячая пляцоўка на 50 дзяцей, з іх 20 з дому швэйнікаў, МЦРК абяцаў забясьпечваць іх рэгулярна.

Пляцоўка будзе знаходзіцца каля фабрыкі. Фабрычныя ясьлі з 60 дзецьмі выехалі на дачу. Але трэба адзначыць, што ня зусім добра быў арганізаван выезд. Ня былі сваячасова падрыхтаваны спальні і харчаваньне.

Наогул у рабоце ясьляй ёсьць той недахоп, што ёсьць пераросткі, больш 4-х гадоў і нават больш 5-ці, якіх не пераводзяць у дзіцячыя сады. Фабком і ясельны савет глядзяць на гэта скрозь пальцы. А між тым затрымліваецца далейшы прыём тых дзяцей ясельнага ўзросту, якіх мацерам-работніцам зусім няма на каго пакінуць. Неабходна гэта пытаньне хутчэй рэалізаваць.



Новы каральны завод у Копысі.

Нядаўна адкрылі дыэтычны пункт на фабрыцы на 90 абедаў для страўнікавых хворых, але дрэнна тое, што фабком паслаў ня толькі страўнікавых хворых. Абедаюць там Сонкін, Меркін, якія ніколі хвароб страўніка ня ведалі. А работніца Мэламэд доўгі час хварэе і засталася без дыэтычнага харчаваньня. Нагляданоцца злоўжыванні талёнамі, якія перадаюцца другім асобам. З такімі фактамі трэба павесьці рашучую барацьбу.

У гэтым годзе 500 рабочых работніц і 20 дзяцей едуць у дамы адпачынку, 35 чалавек пасылаюць на курорты, а 50 чалавек едуць на вытворчыя экскурсіі Ленінград-Масква.

Менск.

Брыгада Міндліна, Падольская, Баркан.

Працяг матар'ялу рэйду рабкорак ударніц Віцебска

гэтым пытаньнем і зьнішчыць такое ненармальнае зьявішча.

Наша ўдарная брыгада рабкорак, праводзячы абсьледваньне па пытаньні ўцягненьня работніц у сацыялістычныя мэтады працы, занялася вярбоўкай работніц ва ўдарныя брыгады. На працягу двух дзён нам удалося завербаваць 47 работніц. Гэту работу будзем праводзіць і надалей.

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка": Ізраілева, Шлід, Ліповіч, Брызгунова, Брацэвіч, Рэдзькава, Брайніна, Мяжкава, Захарава, Захарэўская і Рымэр.

Віцебск.



Громава—варштатны, лепшая ўдарніца белаапрацоўчага цэху Бабруйскага лесакамбінату.

Увагонь і у ВАДУ

Апавяданьне

В. Галіна

Навіна вазака не пацешыла нас.

— Праз раку няма пераправы.

— Як няма?

— Крыга вялікая. І засьветла боязна, а на ноч гледзячы... які дурань выберацца!

— Ня груз мы, перакінемся як-небудзь на лодцы,—угаворвалі мы.

— Як сабе хочаце, толькі без мяне. Мне жыцьцё даражэй заработку.

Што ты скажаш!

Заўтра к поўдню, кроў з носу, а трэба быць на месцы. Брыгада наша мела даручэньне рэдакцыі праверыць падрыхтаванасьць да сяўбы ў некалькіх буйных саўгасах. Саўгасы за ракою. Меркавалі мы: сёньня дабрацца, агледзецца, адпачыць, а зранку, на сьвежую галаву, за працу.

У дарозе адліга засьцігла. Як бачыш, рака ўзьнялася.

Ня ў час Прыпяць масты ледзяныя разбурыла. Стыхія ня знаецца з палітыкай.

Мы яшчэ раз к фурману:

— Мо' перадумаў, павязеш?

Вазак галавою круціць:

— Я-ж кажу: жыцьцё даражэй.

Галашчук сам ня ведае, на каго злуецца, на дзеда, на Прыпяць, ці яшчэ на каго.

— А мы ня людзі, думаеш? Самім паміраць ахвоты няма, а бярэмся ехаць.

Гарачы мой сябра Галашчук, проста запалка.

— Вам што... Напэўна, халасьцякі? Нырца дасьцё—годам раней сьмерць, і толькі таго. А нашаму брату памерці—гаспадарку і жонку з дзецьмі сіратамі пакідаць.

Нічога ня зробіш, стары ведае, што гаворыць. І Прыпяць ня лужа, не пераскочыш.

— Вядзі дзед спаць. А заўтра досьвіткам, як сабе хочаш, а мы павінны быць на тым беразе.

— Даўно-б так. Яно спакайней і мне і вам. Хоць яно і заўтра з рызыкай.

Дзед таптаўся на месцы, пугаў'ём калупаў трухлявы, засмоктаны сьнег. Відаць, дзед яшчэ ня ўсё выказаў.

— Пашлі. Умовіліся, здаецца?

— Ня зусім.

— Як?

„Нездагадлівыя, ці прыкідваецеся?“ — пыталі прыплюшчаныя вочы і ўхмылка дзеда.

— Па траячцы на брата,—запрасіў ён, і мераў вачыма кожнага з нас, ні то вызначаючы вагу, ні то ўгадваючы наш адказ.

Мы пераглянуліся.

— Згодны,—за ўсіх адказаў я.

Вазак насупіўся. Ён прывык таргавацца. Наш адказ неспадзяваны агарошыў яго. Дзед зрабіў крок уперад, шырока растапырыўшы ногі. У такім стане ён затрымаўся на момант, пасьля разам павярнуўся да нас.

— Адумаўся я. Мала з вас запрасіў. Можа самі накінеце, хоць па грывеньцы на тутун?

— Ну, ты ня дзед, а дробны гандаль,—прысароміў яго Галашчук.

— Што вы думаеце, авёс дарагі, не дакупішся аўса. Жывом з гэтага.

Дзед паскроб патыліцу, шапку сьпіхнуўшы на лоб.

— Прагадаў я крыху, мала з вас запрасіў. Але, як той казаў: Умова даражэй грошай“. Толькі заўтра, каб чакаць ня прымусілі. Пастукаю, каб на нагах былі.

— Раней за цябе ўстанем. Толькі каня падкармі, каб вёз, як у сваты.

Падышлі к хаце, з размаляванымі пеўнікамі над вокнамі.

— Тут ваш начлег, умовіліся ўжо. Сьпеце здаровы!

У хаце пахла смалою і квашанаю капустаю. Гаспадыня ветла спаткала нас.

Павячэралі. Закурылі, пачаставаўшы гаспадара гарадзкою папяросінаю. Галашчук праглядаў газэту. Дарваўся ён да слова друкаванага за некалькі дзён, і рады. У возе, на холадзе, не да чытаньня.

Па газэце поўзалі, віхляліся водбліскі полымя з камінка.

— Што новенькага пішуць там, пра калектывы?,—цікавіцца гаспадар.

— Многа чаго пішуць. А ты ня чытаеш?

— Няпісьменныя мы.

— Кепска.

— Вядома кепска. На старасьці вучыцца пачалі, зараз, як калгаснымі сталі. Удзень сын з дачкою ў школу бегаюць, а вечарам—мы з жонкаю няпісьменнасьць сваю ліквідуем. Яна ў мяне ў дэлегатках састаіць,—паказаў гаспадар на жонку.—Заўважыш ёй: „Лепш-бы дома сядзела, старая!“, дык яна прыскам у вочы: „Мы,—кажа,—за два з паловаю гады пяцігодку калгасную выко..ваем, як-жа тут няпісьменным заставацца!

Гаспадыня рупліва прыбірала пасудак.

— Вам з дарогі адпачыць пара. Я пасьцялю, каму на ложку, а каму на лаве прыдзецца. Вы, я бачу, не патрабоўныя людзі, свойскія,—старанна ўзьбіваючы падушкі ў квяцістых навалачках, шчабятала жанчына.

Распраналіся пад коўдраю. Лучыну тушыць з вечара не заведзена. А для гаспадыні вечар толькі пачынаўся.

Яна паклала спаць малое, а большага сына пасадзіла з кніжкаю каля сябе, села за кудзелю.

— І вучыцца трэба і з кудзеляй ніяк не разлучымся,—уздыхнула яна.

Трашчала лучына. Храпака задалі падарожнікі, абагрэтыя хатнім цяплом, дзяружнымі пасьцілкамі і гаспадарскай ветласьцю.

Досьвіткам бразнулі ў шыбу.

— Гэй, гатовы?

— Зараз!

Насьпех непаслухмяныя ногі не пападалі ў бот. Але хутка тапталіся каля возу, мякка пасланага аўсянай саломай.

Паселі. Гаспадара ня было, недзе каля хлява калупаўся. Урэшце ён вярнуўся, паправіў хамут, заняў сваё месца, азірнуўся ў бок хаты.

— Паехалі!

Вазак марудзіў. Хутка мы зразумелі прычыну. З за хаты ўподбежкі выбегла высокая жанчына, у чобатах, у кажушку да кален, паверх кажушка абмотаная вялізнаю чорнаю хусткаю.

Твар жанчыны мы як сьлед не разгледзілі, скмецілі толькі, што з пад хусткі ўпарта выбіўся жмут чорных, кучаравых валасоў.

— Спадарожніца,—здагадаліся мы, і падаліся шчыльней адзін к аднаму, каб даць месца жанчыне.

— Ня турбуйцеся, — папярэдзіла яна нас,—я тутака прысяду.

Яна скочыла на драбіну, прысела ў перадку, побач з гаспадаром, ногі спусьціла на той бок драбіны.

— Дазволь!—папрасіла яна вазака.

Той, як ні ў чым ня бывала, перадаў ёй лейцы, пугу і сам лепш прыстроіўся ў возе.

Каб жанчыне гаспадар перадаў лейцы? Вось гэта сапраўды найвялікшая пашана! Мабыць, сваячка блізкая?—падумалі мы.

— Назад бяры, схавай яе,— перадала пугу жанчына.

— Нно-о, буланы!

Патрусілі па дарозе. Ехалі моўчкі. Нас кідала з аднаго ў другі бок, неперасьціханна. А калёсы стракаталі, каціліся па талай веснавой дарозе. Хутка мінулі апошнюю хату. Выехалі на паскі. Паўночныя бакі ўзгоркаў бліскалі плямамі сьнегу. Здалёк пільнаваў нас маўкліва-задумлівы лес.

— Лодка будзе?

— Заўсёды там. Толькі самі паедзеце. Я вярнуся ад ракі.

— Як?

— Сын з Ханкаю пераправяць. За іх вам заруку даю.

Гэта нам спадабалася. Горш рэдзькі надаела бурчэньне старога. К таму-ж Ханка, як назваў яе вазак, так сьмела трымала ў руках лейцы і губамі так панадна ціўкала на буланага.

Лёд на Прыпяці даўно паадставаў, вырваўшыся з берагоў, пакалоўся і пасунуўся ўперад. У хмурым вадзяным прасторы калываліся сівыя крыжыны.

— Ах, ах,—квактаў стары,—як бачыце пусьціла. Толькі днямі гэтымі пажора пайшла. Я і казаў: канец зіме. Заўсёды так: увосень—трашчу, ды ня пушчу, а ўвесну—і не трашчу, ды пушчу.

Узяўшы за вуздэчку, гаспадар адвярнуў каня.

Ханка адамкнула вялізную лодку. Гуртом сапхнулі лодку з берагу. Дзед падаў з возу сякеру, двое восьцяў і тры вяслы.

Селі ў лодку. Стырнікам сеў сын вазака, на вёслы—Ханка. Калі Галашчук прапанаваў сябе на вёслы, Ханка толькі ўсьміхнулася.

— Сьмялей, сьмялей! — камандуе Ханка.—Не памерзнеце, усім хопіць работы, горача будзе!

— Едзьце здаровыя, — разьвітаўся вазак, засоўваючы грошы за пазуху.

Мы паглядалі на Ханку, любаваліся, як сьмела яна рэжа вяслом ваду, як пад вяслом яе на вадзе закручваецца верчык. Роўна калываліся плечы яе, улітыя ў кажушок. Шчокі жанчыны агнём распаліліся, хустка спаўзала назад, таму час-ад-часу яна зграбала з вачэй абярэмак чорных густых валасоў.

— А вочы якія! Дзе я бачыў гэтыя чорныя вішні?

Вольна ад'ехалі толькі мэтраў пятнаццаць. З правага боку дарогу загарадзілі крыжыны.

— Вышэй трымай!—камандуе Ханка.

Хлапец не ўпраўляўся. Усе бліжэй насоўвалася сіва-сіняя ледзяная гурбіна.

— Назад вярні!—больш сурова загадала жанчына.—Эх, ты, капітан наш сухапутнага плаваньня!

Але было ўжо позна. Крыга апярэдзіла нас, шчыльна заціснула лодку.

Сярэдзіна Прыпяці — чорная лужына. У ёй між крыгамі калываецца наш „карабель". Бачым, як злуецца хмурая вада, як апалосквае яна крыгу. Далей плывуць новыя часткі зімовага маста. Крыга штурхае адна другую, дагнаўшы напаўзае, прабуе пералезьці праз сьпіну другое, шалупіцца срэбна-блакітнай луской.

Восьцямі, вёсламі і сякераю расьцерабілі дарогу назад.

Выбраліся.

— Марш на вёслы!—зграбла Ханка стырніка і заняла яго месца.

Хлапец перасеў паслухмяна, а Ханка яшчэ дужэй налягла на вясло.

Лодка спрытна занырала між крыжынамі. Час-ад-часу крыга стукалася аб прасмоленае рабро нашага „карабля", асыпаючы нас голкамі ледзяных пырскаў. Лодка стагнала, калывалася і, абмінуўшы крыгу, праходзіла ўперад.

А вада чорная, сьцюдзёная. Глыбіня Прыпяці на гэты раз выглядала асабліва вялікай, страшнай і злой.

Хутка мы здужалі ваду, былі на другім беразе.

— Зараз хто куды?—ні то запытала, ні то пацьвердзіла Ханка.

Ніхто не адказаў ёй.

— Вы да нас можа?—зноў запытала жанчына.

— Да каго гэта „да нас"?

— У калгас наш, я думаю. Адсюль менш як кілёмэтр.

(Працяг будзе).



...крыга апярэдзіла нас і шчыльна зацісьнула лодку...

Арганізуем пашы для сьвіней

Стварэньне сацыялістычных фабрык мяса—сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасаў—вырашае труднасьці з забесьпячэньнем мясам. Гаму ўсе калгасьніцы і работніцы, якіх у саўгасах „Сьвінавод", працуе больш 50 проц., павінны прымаць актыўны ўдзел у разьвіцьці сьвінагадоўлі.

Перад сьвінагадоўчымі саўгасамі і калгасамі стаіць задача—адначасова з павялічэньнем стада стварыць уласную кармовую базу, якая зьяўляецца асновай далейшага разьвіцьця сьвінагадоўлі.

Арганізацыя пашы павінна ў нашых напружаных умовах з канцэнтраванымі кармамі замяніць у летні час значную долю гэтых кармоў. Апрача гэтага паша зьяўляецца сродкам для ўмацаваньня здароўя сьвіней, а мы павінны ведаць, што толькі здаровае стада дае здаровы прыплод і павышае таварную прадукцыю мяса.

Утрыманьне сьвіней на пашы дае вялікія гаспадарчыя выгады яшчэ і тым, што зялёныя расьліны зьяўляюцца кармамі, багатымі вітамінам, бялком што значна павялічвае прырост маладняка і скарачае затраты корму. Такім чынам, утрыманьне сьвіней на пашы можа зьнізіць сабекошт на 30-40 пр. Задача арганізацыі пашы заключаецца ў тым, каб забясьпечыць усё сьвіное стада на летні час сьвежым зялёным кормам. У гэтым абсягу ў нас ёсьць вялікія магчымасьці. У кожным раёне растуць такія расьліны, якія могуць быць выкарыстаны для пашы сьвіней. Лепшымі расьлінамі пашы зьяўляюцца наступныя:

1. Канюшына чырвоная—расьліна найбольш спажыўная для сьвіней. Пашу трэба пачынаць з моманту, калі расьліна дасягае 20 сантымэтраў вышыні. Пашу з вясны можна пачаць на канюшыне пасеянай у 1930 годзе. А на канюшыне, пасеянай у 1931 годзе, можна пачынаць толькі ўвосень, аднак, трэба пільна сачыць, каб сьвіньні яе ня рылі. Ня можна выпускаць сьвіней на канюшыну ў дажджлівае надвор'е.

2. Віка-аўсяная мешаніна. Віка-аўсяная аўсяна-гарохавая мешаніна, пасеяная раньняй вясной, праз 5-6 тыдняў ужо можа быць прыгоднай для пашы. Спасаваць яе можна тады, калі расьліна дасягае 20 сантымэтраў вышыні. Каб забясьпечыць найбольш доўгі тэрмін карыстаньня гэтай пашай, можна высяваць віку з аўсом у розныя тэрміны, каб у момант спасваньня аднаго поля, было ўжо гатова другое.

3. Кораньплоды—больш слабыя вучасткі гэтай культуры, якія ня могуць быць выкарыстаны; пасьля ўборкі могуць быць выкарыстаны для пашы.

4. Азімае жыта з азімай вікай можа быць самай раньняй пашай, таму неабходна ўвосень у кожным саўгасе і калгасе засеяць азімым збожжам і вікай пэўныя вучасткі для пашы.

Апрача пералічаных культур, пад пашу можа быць скарыстана люцэрна, якая зьяўляецца найбольш каштоўнай культурай пашы, але, з-за адсутнасьці належнай колькасьці насеньня яе, ня мае яшчэ ў нас пашырэньня. Аднак, у будучым гэта культура будзе мець у нас вялікае значэньне.

Рад саўгасаў і калгасаў яшчэ ня ў поўнай меры забясьпечаны штучнымі выпасамі, таму неабходна як можна паўней скарыстаць натуральныя выпасы, лугі, зарасьлі, узьбярэжжы рэчак і лясныя выпасы.

Скарыстоўваць пашу трэба ў строга плянавым парадку з такім разьлікам, каб пасьля скарыстаньня аднэй пашы сьвіньні пераходзілі на другую. У пляне неабходна для кожнай групы паказваць вучастак і тэрмін пасьбы на гэтым вучастку.

У гарачы час нельга пасьвіць сьвіней, каб унікнуць цеплавых удараў. Пасьвіць трэба ўранку і ўвечары. Удзень трэба іх трымаць у цяні—у лесе ці ў іншым месцы, забясьпечваючы заўсёды іх чыстай вадой.

Разьлік патрэбы ў пашы можа выходзіць з наступных лічбаў: 1 гектар штучнай пашы можа забясьпечыць зялёнай масай на працягу 100 дзён 25 падсьвінкаў з сярэдняй вагой у 40 кілёграм. Адзін гэктар пашы можа пракарміць 12,5 матак на працягу 100 дзён.

Сьвіное стада трэба разьбіць на гурты па 30 штук у гурце. Маткі непаросныя і паросныя па 150 штук у гурце. Перагон сьвіней ад месца іх стаянкі не павінен перавышаць для матак з парасятамі і паросных 1,5 кілёмэтра, для непаросных і іншых груп—1,5 да 2,5 кілёмэтра.

Для добрага паяданьня травы на пашы сьвіней трэба выганяць без папярэдняга падкорму, а пасьля пашы значна скараціць дачу канцэнтраваных кармоў. Пры ўсім гэтым трэба пільна сачыць, як гэта уплывае на сьвіней, калі яны тлусьцеюць, то дачу канцэнтраваных кармоў трэба зьмяншаць, а калі яны худзеюць, то трэба яе павялічваць.

Аграном Гаруленка.



Работа з дашкольнікамі на гародзе

Правільнае скарыстаньне прыроды, якая акружае дзяцей, адыгрывае вялікую ролю ў выхаваньні. Дзіця бачыць у прыродзе ўзьнікненьне, разьвіцьцё, зьнішчэньне і зьмену розных зьявішч. У прыродзе дзіця стыкаецца з рэальнымі фактамі і зьявішчамі, якія могуць быць даступны яго самастойнай дасьледчай рабоце.

Работа ў прыродзе важная ў барацьбе з забабонамі і перажыткамі старога быту, якія маюць рэлігійнае тлумачэньне ўсіх зьявішч прыроды. Праз правільна пастаўленую работу ў прыродзе мы выхоўваем бязбожнікаў. Напрыклад, дзіця пад уплывам старэйшых лічыць, што ў Ільлін дзень нельга працаваць, бо тых, хто працуе, заб'е маланка. Трэба наладзіць работу ў гэты дзень, а потым рабіць належныя вывады. Другі прыклад—дзіця лічыць, што жабу нельга браць у рукі таму, што бародаўкі пойдуць. Трэба на вопыце паказаць дзіцяці, што гэта ня так.

Кіраўнік, улічваючы сілы дашкольніка і ўмацаваньне яго здароўя, а таксама неабходнасьць удзелу ў наўкольным жыцьці, арганізуе працу дзяцей у прыродзе, на сваім дашкольным вучастку. Работа на вучастку вельмі рознастойная. У гэтым артыкуле мы спынімся на рабоце ў гародзе.

Тут дзеці маюць магчымасьць выявіць уласную іх узросту актыўнасьць. Працуючы на гародзе, дзеці арганізуюцца невялікімі групамі і навучаюцца калектыўна працаваць. На гародзе яны працуюць па-сапраўднаму, вучацца шанаваць працу дарослых, атрымліваюць і разьвіваюць працоўныя, арганізацыйныя навыкі.

Даглядаючы расьліны, дзеці сочаць за іх ростам і разьвіцьцём, цьветам, зьяўленьнем плада і насеньня, даведваюцца аб шкодніках гародных расьлін, змагаюцца з імі і такім чынам устанаўляюць прычынную сувязь, што ад добрага догляду, а не ад бога—добры ўраджай.

Месца для гароду выбіраецца найбольш адкрытае. Гэта неабходна для дзяцей, каб яны дыхалі чыстым паветрам, а таксама і для расьлін. Можна адну градку зрабіць у цяні, каб дзеці дасьледчым шляхам дайшлі да таго, дзе лепш расьце расьліна. (Залежнасьць прарастаньня ад сонца).

Разьмер плошчы павінен быць такі, каб дзеці змаглі апрацаваць яго без перагрузкі. У сярэднім бярэцца ад аднаго да 1¼ квадратовых мэтраў на кожнае дзіця. Уся плошча гароду не выкарыстоўваецца для насаджэньня таму, што каля паловы павінна быць занята барознамі, якія па шырыні павінны быць такімі, каб двое дзяцей маглі вольна разыйсьціся пры сустрэчы. Шырыня кожнай баразны павінна быць у 50 сантымэтраў. Градкі па сваіх разьмерах могуць быць розныя. Даўжыня іх не павінна быць вялікая—ад двух да трох мэтраў, каб дзіця з аднэй да другой градкі не рабіла вялікіх пераходаў. Шырыня градкі павінна быць такой, каб дзіця пры рабоце магло дастаць да сярэдзіны, г. зн. ня больш 70—75 сант.

З усіх бакоў гароднай пляцоўкі павінны быць зроблены разоры, па якіх дзеці маглі б вольна хадзіць. Вышыню градак можна зрабіць да 30 сант. Прылады для апрацоўкі па сваіх разьмерах і вазе павінны адпавядаць узросту і сілам дзіцяці. Рыдлёвачкі: даўжыня ручкі—75 сант., разьмер самой рыдлёвачкі 20 × 16. Граблі: ручка—95—100 сант. Вядро і лейка: дыямэтр асновы—14 сант., а вышыня—18—20 сант. Насілкі агульныя—да 120 сант. Даўжыня скрынкі—30—35 сант., вышыня—6 сант., плошча скрынкі—20 × 25 сант.

Вага рыдлёўкі і грабель не павінна перавышаць 800 грам, вядра—4.600 грам, лейкі—да 800 грам.

Для правільнай арганізацыі работы на гародзе вялікае значэньне мае наяўнасьць патрэбнай колькасьці інвэнтару, каб усе дзеці маглі прымаць удзел у рабоце, а, з другога боку, выхоўваць калектывіста, г. зн. не для кожнага дзіцяці трэба рабіць інвэнтар.

Пры выбары культур ня трэба ўводзіць вялікай рознастайнасьці, каб не расьсейвалася ўвага дзяцей. Расьліны павінны быць не пераборлівымі ў адносінах да глебы і догляду іх, а павінны быць лёгкія для апрацоўкі сіламі дашкольнікаў. Карысна ўзяць такія культуры, якія хутка высьпяваюць, каб дзеці бачылі вынікі сваёй працы, і якія прыцягваюць дзяцей сваім смакам. Гэтыя патрабаваньні задавальняюць: радыска, салата, морква, цукровы гарох, цыбуля, гуркі і г. д., а таксама неабходна пасеяць бульбу. Каб не перагружаць дзяцей рознастайным матар'ялам, трэба ў першы год узяць 3—4 культуры.

Збор ураджаю трэба прыстасаваць да дня ўраджаю і калектывізацыі.

Уся гародніна зьяўляецца матар'ялам, на якім дзеці знаёмяцца з формай, хварбай, вялічынёй, пахам і смакам.

Калі пасеў на гародзе закончан, дык для догляду гародаў выбіраецца камісія з некалькіх дзяцей. Камісія зьмяняецца праз некалькі дзён. Догляд гароду заключаецца галоўным чынам у паліўцы, поліве, прарэджваньні, успульхненьні, расстаноўцы падпорачак і г. д. Паліваць трэба раніцой ці ўвечары, калі спадае гарачыня. Прарэджваньне трэба пачынаць, калі ўсходы ўмацаваліся, тады вырываюцца больш слабыя расьліны.

Адну градку трэба пакінуць бяз догляду, каб дзеці ўбачылі на вопыце, што бяз працы чалавека расьліны заглохнуць.

Прарэджваньне—самая цяжкая работа для дзіцяці, бо яму цяжка аддзяліць адну расьліну ад другой. Апрача таго работа вельмі марудная і таму яна павінна рабіцца піянэрамі. Малодшыя дзеці наглядаюць, а старэйшыя дапамагаюць.

Усе работы павінны быць так арганізаваны, каб яны выклікалі зацікаўленасьць дзяцей і адпавядалі іх сілам. Трэба так арганізаваць работу, каб дзеці ня былі заняты адным працэсам працы доўгі час, а часта зьмяняць работу. Дзеці павінны працаваць у дзень ня больш 50 мінут, калі не пячэ сонца.

Для хаваньня інструмантаў патрэбен хлеў, дзе павінна быць месца для кожнага інструманту. Толькі пры правільнай арганізацыі і чаргаваньні работ на гародзе дзеці атрымліваюць патрэбныя веды аб прыродзе і працоўныя навыкі і ўмацоўваюць сваё здароўе. Апрача працы ў сябе на гародзе дзеці могуць дапамагаць у калгасе—зьбіраць шкоднікаў, выбіраць гатовую гародніну і г. д.

Шэйніна.

Што павінна ведаць аб сухотах кожная работніца і сялянка

(*Працяг*)

Калі ў першай частцы нашага артыкулу мы падрабязна спыніліся на пытаньні аб прычынах заражэньня сухотамі і мерах перасьцярогі, то сёньня мы павінны расказаць аб двух прадметах, якія маюць значэньне для кожнай жанчыны. Першае пытаньне — наконт сухотаў, цяжарнасьці і кармленьня; другое—барацьбы з сухотамі ў дзіцячым узросьце.

Сухоты, цяжарнасьць і кармленьне. Гэта пытаньне мае вялікае практычнае значэньне і распадаецца на наступныя пытаньні: 1) Ці можна з пункту погляду доктара сухотнай дзяўчыне выходзіць замуж? 2) Ці можна сухотнай жанчыне стаць цяжарнай? 3) Ці павінна хворая на сухоты жанчына абавязкова зрабіць сабе аборт і калі? 4) Ці дазваляецца сухотнай матцы карміць дзіця грудзьмі і што ёй наогул рабіць, каб усьцерагчы дзіця ад заражэньня сухотамі.

На першае пытаньне трэба адказаць так: дзяўчына хворая на сухоты, якая жадае выйсьці замуж, павінна раней за ўсё параіцца з доктарам, у якога яна знаходзіцца пад наглядам. Толькі сумесна з доктарам павінна быць вырашана гэта сур'ёзнае пытаньне. Сухотная жанчына, у асаблівасьці жанчына з актыўным працэсам сухотаў, павінна асьцерагацца цяжарнасьці. У гэтым выпадку, аднак, неабходна параіцца з доктарам-спэцыялістам па сухотах. Многія людзі лічаць сябе сухотнымі, а ў сапраўднасьці яны ня маюць сухотаў. У некаторых выпадках гутарка ідзе аб вылечаных сухотных зьменах, якія існавалі шмат гадоў таму назад.

Ці абавязкова трэба зрабіць аборт сухотнай жанчыне ў выпадку цяжарнасьці? Пытаньне аб аборце ў кожным асобным выпадку павінна быць вырашана сумесна з доктарам. Вельмі важна, каб цяжарная хворая на сухоты не вырашыла сама гэтага пытаньня. Калі доктар скажа, што аборт неабходны—трэба яго рабіць. Доктар, значыць, лічыць, што ў гэтым выпадку цяжарнасьць і роды могуць выклікаць абвастрэньне хваробы, якая дрэнна адбіваецца на хворай. Разам з тым мы павінны напомніць аб тым, што частыя аборты наогул шкодны, асабліва хворым на сухоты жанчынам. Адсюль важнасьць ужываньня сродкаў, прадахоўваючых ад цяжарнасьці, для тых жанчын, хворых на сухоты, якім не дазваляецца быць цяжарнымі.

Часта бываюць выпадкі, калі жанчына, шчасьліва прайшоўшы праз цяжарнасьць, захворвае пасьля родаў ці ў часе кармленьня. Няхай-жа ўсякая сухотная, зацяжарыўшы, зараз-жа прыдзе да свайго доктара за парадай.

Яшчэ складаней стаіць пытаньне з кармленьнем груднога дзіцяці. Для маткі кармленьне можа быць аднэй з прычын абвастрэньня хваробы, для дзіцяці—крыніцай заражэньня сухотамі. У апошнім выпадку гутарка ідзе не аб магчымасьці заражэньня праз малако маткі, а аб блізкасьці рота маткі, пакашлю, пацалункаў і інш. Як мы вырашаем пытаньне ў гэтых выпадках? Калі дзіця зусім ня церпіць штучнага кармленьня, а становішча здароўя маткі адносна добрае, можна дазволіць карміць дзіця грудзьмі. Але ў гэтых выпадках мы патрабуем ад маткі ўсіх мер асьцярожнасьці, каб не заразіць дзіця. Няхай матка надзявае маску на



Працірка вокан у фабрыцы-кухні.

рот і нос і чысты халат у часе кармленьня. Матка, якая ня хоча страціць сваё дзіця, аб усім гэтым павінна падумаць.

Як змагацца з сухотамі ў дзіцячым узросьце? Аб тым, што сухоты пачынаюцца ў дзіцячым узросьце і што трэба на гэта зьвярнуць шмат увагі, наша чытачка ўжо ведае. Дзіцячы арганізм ня можа аказаць належнага супраціўленьня ўзбуджальніку хваробы. З другога боку, натуральныя сілы прыроды—сонца, паветра і вада, разумнае карыстаньне імі адыгрываюць вялікую ролю.

У нашу задачу зараз не ўваходзіць апісаньне розных форм сухотаў дзіцячага ўзросту—сухотаў залоз—„залатуха", сухотаў касьцей, суставаў, брушыны, скуры, лёгкіх і раду іншых.

Дзяцей трэба загартоўваць. Дзяцей трэба прывучаць да сьвежага паветра, купаньня, да фізкультуры, сонца (карыстацца ім у паступова ўзрастаючых дозах, унікаючы перагрэву і апёкаў). Трэба ўнікаць хутаньня дзіцяці, прывучаць яго з маленства спаць улетку пры адкрытым вакне, пры адкрытай фортцы. Хай дзеці бегаюць улетку ў адных трусіках; ад гэтага яны толькі стануць здаравейшымі. Абвесьцім рашучую барацьбу сьпёртаму паветру ў сялянскай хаце, цяляці і сьвіньні, якія жывуць у хаце, прыбітай з баязлівасьці „прастуды" фортцы, а галоўным чынам прывешанай да столі калысцы, у якой прэе дзіця з галавой завешанай коўдрай.

А. Поляк.

Имя 1953 г. БА 831

Што зроблена па допісах рабселькорак

Адноўлена кіраўніцтва Карпілаўскага сельсавету

Глуская райКК-РСІ паведаміла, што ў рабоце **Карпілаўскага сельсавету** быў правы ўхіл, ня былі даведзены цьвёрдыя заданьні да кулакоў і заможнікаў. За гэта судзілі старшыню і членаў сельсавету. Пры новым кіраўніцтве справа значна палепшылася. Узмоцнен націск на кулацка-заможную частку па загатоўках. У калгасе ў вёсцы Карпілаўцы налічваецца ўжо не 12, а 48 сем'яў. Частка членаў сельсавету ўступіла ў калгас.

Загадчык сталоўкі станцыі Крычаў зьнят з працы

Допіс рабкоркі аб злоўжываньнях у сталоўцы на станцыі Крычаў пацьвердзіўся. Загадчык сталоўкі зьнят з працы. Прыняты меры для паляпшэньня работы сталоўкі і яе прапускной здольнасьці. Аб гэтым паведаміла Крычаўская КК-РСІ

Лістаносец Купрэйчык прыцягнут да судовай адказнасьці

Па скарзе чытачкі Плявака аб тым, што лістаносец Купрэйчык даставіў ёй часопіс, на якой ім быў зроблен абразьлівы надпіс, Смалявіцкая раймоліцыя правяла расьсьледваньне. Справа аб абразе падпісчыцы часопісі Купрэйчыкам накіравана ў нарсуд.

Настаўніца Кісельдорф атрымала вымову

Дрысенская КК-РСІ паведаміла, што допіс аб заціску самакрытыкі ў Цястоўскай школе пацьвердзіўся. Настаўніца Кісельдорф атрымала вымову.

Вылучан новы кіраўнік дэлегацкага сходу

Па допісе аб тым, што кіраўнік яўрэйскага дэлегацкага сходу Фрыдман не правёў ніводнага сходу дэлегатак, Халопеніцкі райком КП(б)Б паведаміў, што вылучан новы кіраўнік дэлегацкага сходу.

За некамуністычныя паводзіны атрымаў вымову

Допіс аб зьдзеках члена партыі **Новікава** ў адносінах да таварыша **Пыш пацьвердзіўся**. Ельская райКК-РСІ паведаміла, што Новікаву за некамуністычныя паводзіны вынесена вымова.

Ячэйка прыняла меры

Факты ў заметцы „Заціск самакрытыкі" аб няправільных паводзінах члена партыі **Багдановіч** пацьвердзіліся. Чарэйскай ячэйкай КП(б)Б прыняты меры ўадносінах да Багдановіч.

Праца сталоўкі палепшылася

На допісах аб недахопах у Талачынскай сталоўцы райпо паведаміла, што зараз сталоўка забясьпечана пасудкам. Праўленьнем прыняты меры да зьнішчэньня выпадкаў, калі спажыўцом падаваліся недавараныя абеды. Да 1-га чэрвеня заканчваецца пабудова новага памяшканьня для сталоўкі.

Кулацкі падпявала Семянюк перадан суду

Халопеніцкая РКК-РС паведаміла, што допіс селькоркі аб скрыўленьні клясавай лініі старшынёю Ўзнацкага сельсавету Семянюком цалкам адпавядае сапраўднасьці. Семянюк зьнят з працы і аддан пад суд.

Партспагнаньне за кепскае кіраўніцтва дэлегацкім сходам

Па допісе селькоркі аб нядбайных адносінах тав. Шычко да работы дэлегацкага сходу, Сьмілавіцкі райжанорг паведаміў, што Шычко пастаўлена на від.

Сакратар ячэйкі зьнят з працы

Па допісе селькоркі „Сустракаем цяжкасьці" было праведзена расьсьледваньне. **Жыткавіцкі райком КП(б)Б** паведаміў, што сакратар Людзьяніцкай парт'ячэйкі Сядлоўскі за дрэннае кіраўніцтва работай з працы зьнят і справа аб ім перадана ў райКК.

Грошы на пабудову трактара імя час. „Бел. Раб. і Сял." трэба пераводзіць на бягучы рахунак у Дзяржбанку № 52/100601.

ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСКУ НА ЧАСОПІСЬ

БЕЛАРУСКАЯ

РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

НА ДРУГУЮ ПАЛОВУ 1931 Г.

НА ПОШЦЕ

і ўпаўнаважаных па падпісцы на прадпрыемствах

Выданьне **ЦК КП(б)Б.** *Рэдактар* **Г. Рагазіньнікава.**

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1168. У ліку экз. 13.960. Галоўлітбел № 434.